Пролетарыі ўсіх краін, єднайцеся!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б)Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 30 (50) Нядзеля, 5 жніўня 1945 г.



**СЁННЯ РАБОЧЫЯ, СЛУЖАЧЫЯ І ІНЖЫНЕРНА—ТЭХНІЧНЫЯ РАБОТНІКІ ТРАНСПАРТА АДЗНАЧАЮЦЬ ЗНАМЯНАЛЬНУЮ ДАТУ—СТАЛІНСКІ ДЗЕНЬ ЧЫГУНАЧНІКА.**

## СТАЛІНСКІ ДЗЕНЬ ЧЫГУНАЧНІКА

Сёння рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі чыгуначнага транспарта Савецкага Саюза адзначаюць Сталінскі дзень чыгуначніка. Гэты дзень—вялікае свята не толькі для чыгуначнікаў, але для ўсяго савецкага народа.

Чыгуначны транспарт развіваўся і рос разам з усімі галінамі народнай гаспадаркі нашай радзімы. Партыя і савецкі ўрад удзялялі і ўдзяляюць вялікую ўвагу развіццю транспарта і ў першую чаргу чыгуначнага транспарта.

„СССР, як дзяржава, быў бы немыслім без першакласнага чыгуначнага транспарта, звязваючага ў адзінае цэлае яго шматлікія абласці і раёны. У гэтым вялікае дзяржаўнае значэнне чыгуначнага транспарта ў СССР" (СТАЛІН).

У перыяд мірнага развіцця нашай краіны, у годы сталінскіх пяцігодак чыгуначны транспарт савецкай дзяржавы вырас у вялікую сілу. Мільёны пудоў розных грузаў бесперабойна дастаўляліся ва ўсе куткі вялікага Савецкага Саюза.

У перыяд вайны з нямецкімі захопнікамі наш чыгуначны транспарт вытрымаў такую нагрузку, з якой наўрад ці справіўся-б транспарт другой любой краіны. Дастаткова сказаць, што толькі з ліпеня па снежань 1941 г. чыгуначнікі перавезлі ў глыб краіны больш мільёна вагонаў розных эвакуіраваных грузаў.

Не гледзячы на ўсе цяжкасці ваеннага часу чыгуначныя дарогі паспяхова выконвалі зданні Урада і ваеннага камандавання.

„І калі не гледзячы на цяжкасці ваеннага часу і недахоп паліва нам усё-ж удалося забяспечваць фронт усім неабходным, то ў гэтым трэба прызнаць перш за ўсё заслугу нашых ТРАНСПАРТНЫХ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ" (СТАЛІН)

Радзіма па дастоінству ацаніла самаадданую працу чыгуначнікаў. Гэта іх многаму абавязвае. На транспарце не павінны быць адстаючых участкаў, бо ён з'яўляецца тым канвеерам, дзе важна работа кожнага чалавека, кожнага вінціка. Зладжанасць і яшчэ раз зладжанасць паміж усімі звеннямі гэтага канвеера—вось чаго нястомна павінны дабівацца чыгуначнікі.

Ва славу нашай Радзімы, да новых перамог, таварышы Чыгуначнікі!

## НАША СВЯТА

Вялікімі вытворчымі перамогамі адзначаюць сваё вялікае свята—Сталінскі дзень Чыгуначніка—рабочыя і служачыя 3-й дыстанцыі службы пуці. Прадсвяточнае сацыялістычнае спаборніцтва значна павысіла прадукцыйнасць працы ўсяго калектыва дыстанцыі.

Перадавыя рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі як маставы майстар Міховіч Іван, тэхнік пуці Калугіна, каваль Дашкевіч Іван, молатабоец Цітоў Пётр, слесар Попка Віктар, пуцявы абходчык Пархомчык Фёдар, рамонтны рабочы Сітко Грыгорый, пераездны вартаўнік Зыбайла Надзя і многія другія прышлі к дню Чыгуначніка з выкананнем вытворчых норм больш чым на 150 процантаў.

Наша свята авеяна вялікай перамогай савецкага народа над смяртэльным ворагам нашай радзімы—гітлераўскай Германіяй. Мірная абстаноўка патрабуе ад нас, чыгуначнікаў, яшчэ больш напружанай працы. Мы павінны прывесці ва ўзорны парадак усю нашу пуцявую гаспадарку для бесперабойнай работы зімой, выканаць план капітальнага будаўніцтва, поўнасцю падрыхтавацца да барацьбы з снегазаносамі ў зімовы перыяд.

У гэты радасны святочны дзень хочацца сказаць, што на базе шырокага сацыялістычнага спаборніцтва ў часць нашай перамогі над ворагам рабочыя і служашчыя 3-й дыстанцыі службы пуці справяцца з усімі задачамі, якія паставяць перад імі партыя і ўрад.

Сакратар партарганізацыі 3-й дыстанцыі службы пуці ЦІШЧАНКА.

## НА ПАЛЯХ РАЁНА

### Ідуць уперадзе:

ПАДСТАРЫНЬСКІ СЕЛЬСОВЕТ (старшыня Выканкома сельсовета т. Васілевіч). План уборкі зернавых выканан на 51,6 проц.

ЯГЛЕВІЦКІ СЕЛЬСОВЕТ (старшыня Выканкома сельсовета т. Левашэня), які выканаў план уборкі на 40 проц.

ІВАЦЭВІЦКІ ПАСЯЛКОВЫ СОВЕТ (старшыня Выканкома пасялковага совета т. Ракіш). План уборкі зернавых выканан на 38,1 проц.

### Адстаюць:

Любішчыцкі сельсовет (старшыня Выканкома сельсовета т. Касавец). План уборкі зернавых выканан на 13,8 проц.

Альбінскі сельсовет (старшыня Выканкома сельсовета т. Гарбелік), які выканаў план уборкі зернавых на 15,2 проц.

Жытлінскі сельсовет (старшыня Выканкома сельсовета т. Колтун). План уборкі зернавых выканан на 16,2 проц.

## З чым мы прышлі к Сталінскаму Дню чыгуначніка

**В. САМАЛАХА,**
**Нач. станцыі Івацэвічы, інжынер-лейтэнант.**

Адступаючы пад ударамі Чырвонай Арміі нямецка-фашысцкія захопнікі поўнасцю разрушылі чыгуначную станцыю Івацэвічы. Памяшканне станцыі і ўся пуцявая гаспадарка былі разбураны, спалены і прыведзены ў нягоднасць.

Нешматлікаму калектыву чыгуначнікаў, якія прыбылі сюды ўслед за наступаючай Чырвонай Арміяй прышлося прыкласці многа арганізатарскіх і творчых намаганняў, каб як мага хутчэй прывесці ў парадак станцыйную гаспадарку, забяспечыць прыём і адпраўку цягнікоў.

Прайшло больш года. Як прыемна зараз аглянуцца на пройдзены шлях вялікай аднаўленчай работы. За гэты час сіламі рабочых станцыі пабудован пакгауз для захавання грузаў, пажарны сарай, стрэлачны пост і г. д. За гэты-ж час адноўлен барак для размяшчэння пасажыраў. У ім абарудаваны пасажырскі зал, чырвоны куток і рад другіх службовых і грамадскіх пакояў. Набыт стрэлачны інвентар. Усё гэта зроблена ўласнымі сіламі, што дало 85 тысяч рублёў эканоміі.

Акрамя гэтага адноўлены 3 пад'ездных пуці, 4 пагрузачна-разгрузачных пуці, 2 тупіковых пуці, і г. д.

Праводзячы вялікія будаўнічыя і аднаўленчыя работы кіраўніцтва станцыі ўдзяляла вялікую ўвагу падбору і падрыхтоўцы кадраў. Гэту задачу мы рашылі на месцы. За перыяд з дня вызвалення раёна падрыхтована 5 дзяжурных па станцыі, 10 старшых стрэлачнікаў, 12 малодшых стрэлачнікаў, 3 білетныя і 2 таварныя касіры, адзін тэхнічны канторшчык, 4 вагаўшчыкі.

Трэба адзначыць, што ўсе аднаўленчыя, будаўнічыя і другія работы на станцыі праходзілі пад сцягам шырока разгорнутага социялістычнага спаборніцтва. Дастаткова сказаць, што толькі з новапрыбыўшых на чыгуначны транспарт 32-х чалавек маецца 16 стаханаўцаў і 15 ударнікаў. Прыклад выдатнай працы паказвае дзяжурны па станцыі т. Шчэрбачэвіч. На працягу ўсяго перыяда ён працуе без брака, выконвае план пагрузкі на 650 проц.

Прастой вагонаў пры заданні ў 14 гадзін ён скараціў да 4-х гадзін. Старшы стрэлачнік Дудзік Васіль трымае стрэлкі ў добрым, спраўным і чыстым становішчы, падрыхтаваў свой пост да зімы. Прыбіральшчыца Герман Ліда трымае пасажырскае і службовыя памяшканні ва ўзорнай чыстаце, без адрыва ад вытворчасці авалодала прафесіяй малодшага стрэлачніка.

Добра працуюць грузчыкі Клютка Александр і Кулініч Нікалай, столяр Сватко, жэсцянік Клютко П, таварныя касіры т. т. Дэражынскі і Попка. Яны з чэсцю выконваюць узятыя на сябе абавязацельствы.

Зладжаная работа ўсяго калектыва забяспечыла высокія паказчыкі работы станцыі. План пагрузкі з 1 жніўня 1944 года па 1 жніўня 1945 г. станцыя выканала на 261,5 проц. Паспяхова выконваюцца і разгрузачныя работы.

На раду са значнымі поспехамі, якімі адзначаем мы наша свята—Сталінскі дзень чыгуначніка, у нас ёсць яшчэ многа недахопаў. Для іх ліквідацыі патрабуецца многа стараннай работы ўсяго нашага калектыва. Перш за ўсё трэба разабраць разбуранае памяшканне станцыі і прыступіць да яго адбудовы, поўнасцю аднавіць і прывесці ў эксплатацыйную прыгоднасць усе пад'яздныя пуці і тупікі. Пры агульным намаганні і самаадданай рабоце ўсіх служб, якія знаходзяцца на станцыі, мы з чэсцю залечым раны, нанесеныя вайной нашаму транспарту.

## Да вынікаў парламенцкіх выбараў у Англіі

ЛОНДАН, 27 ліпеня. (ТАСС). Як перадало агенцтва Рэйтэр, згодна канчатковых даных, па 627 выбарчых акругах было выбрана ў англійскі парламент лейбарыстаў — 390, кансерватараў—195, лібералаў—11, нацыянал-лібералаў — 14, незалежных—10, комуністаў—2 і г. д. Вынікі выбараў па 12 універсітэцкіх выбарчых акругах стануць вядомы на будучым тыдні і па адной выбарчай акрузе, дзе памёр балатыраваўшыйся ў ёй лейбарысцкі кандыдат,—9 жніўня,

Усяго ў саставе новага парламента будзе 640 членаў супроць 615, выбраных на выбарах у 1935 годзе.

## Сфарміраванне новага Англійскага ўрада

ЛОНДАН, 27 ліпеня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, прэм'ер-міністр Клемент Этлі сёння аб'явіў аб наступных назначэннях на ўрадавыя пасты:

Прэм'ер-міністр Клемент Рычард Этлі: лорд-старшыня совета—Герберт Марысон,

Міністр замежных спраў—Эрнест Бевін;

лорд—хавальнік пячаткі—Артур Грынвуд;

міністр фінансаў—Х'ю Дальтон;

міністр гандлю — Стафорд Крыпс;

лорд-канцлер—Уільям Джоўіт.

Лорд—старшыня совета—Герберт Марысон будзе лідэрам палаты абшчын.

Этлі заявіў, што аб далейшых назначэннях будзе аб'яўлена ў свой час.

* * *

Лондан, 29 ліпеня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што адкрыццё новага англійскага парламента перанесена з 8 на 15 жніўня.

Пачынаючы з 15 жніўня, калі кароль скажа сваю прамову, парламент будзе засядаць на працягу 2-х тыдняў, пасля чаго пачнуцца летнія канікулы.

Адказны рэдактар А. П. РУДОЙ.

Г Л 15277, Адрас рэдакцыі: гарадскі пасёлак Івацэвічы, вул. Шасэйная, дом № 11